# Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР Міністра замежных спраў Беларускай ССР

# К. В. Кісялёва

## на юбілейнай сесіі ААН у Сан-Францыско 23 чэрвеня

«Пан старшыня!
Панове дэлегаты!

У якасці прадстаўніка Беларускай ССР дазвольце мне вітаць прысутных тут прадстаўнікоў 60 краін—членаў ААН і далучыцца да тых дэлегацый, якія ўжо з гэтай трыбуны выказалі падзяку мэру і грамадзянам горада Сан-Францыско за аказаную гасціннасць.

Мы сабраліся сюды для таго, каб адзначыць 10-ю гадавіну стварэння ААН і падвесці некаторыя вынікі работы ААН за 10 год яе існавання. Як вядома, стварэнне ААН было задумана ў той перыяд, калі другая сусветная вайна была ў поўным разгары. Заснавальнікі ААН, кіруючыся высакароднай мэтай выратаваць будучае пакаленне ад бедстваў новых войн, паклалі ў аснову ААН прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з рознымі грамадска-палітычнымі сістэмамі з тым, каб ажыццявіць такое міжнароднае супрацоўніцтва, якое ў найбольшай меры адпавядала-б інтарэсам усіх міралюбівых дзяржаў. Гэты прынцып знайшоў сваё канкрэтнае адлюстраванне ў Статуце ААН, у прэамбуле якога запісана, што дзяржавы павінны праяўляць цярплівасць, жыць у міры адна з другой, як добрыя суседзі, і аб'ядноўваць свае намаганні для падтрымання міру і бяспекі ва ўсім свеце. На гэтай-жа аснове быў створан і Совет Бяспекі, у якім дзейнічае прынцып

Прадстаўнікі многіх дзяржаў, якія выступалі да мяне, удзялілі вялікую ўвагу пытанню забароны атамнай і вадароднай зброі, скарачэнню ўзбраенняў і ўзброеных сіл і ліквідацыі пагрозы новай вайны. Важнасць вырашэння гэтых праблем сучаснасці ўсім відавочная. Аднак прыходзіцца канстатаваць той факт, што дыскусія ў ААН па гэтых праблемах цягнецца ўжо 10 год, а станоўчых вынікаў не відаць. Між тым, народы ўсіх краін патрабуюць ад ААН хутчэйшага вырашэння пытання аб забароне атамнай і вадароднай зброі і ліквідацыі пагрозы новай вайны.

Совецкі Саюз, галоўнай задачай знешняй палітыкі якога з'яўляецца захаванне і ўмацаванне міру і прадухіленне новай вайны, нязменна, пачынаючы з 1946 года, дабіваецца ў ААН вырашэння гэтай важнейшай міжнароднай праблемы. Ён даў ужо нямала канкрэтных доказаў свайго імкнення вырашыць раз і назаўсёды жыццёва важную для народаў усіх краін праблему раззбраення і забароны атамнай, вадароднай і іншых відаў зброі масавага знішчэння. Усе прапановы СССР у ААН ставяць мэтай—пакончыць з гонкай узбраенняў, правесці істотнае скарачэнне ўзбраенняў і ўзброеных сіл, забараніць атамную і вадародную зброю, выкарыстоўваць атамную энергію толькі для мірных мэт.

манскай Федэральнай Рэспублікай і Совецкім Саюзам, якія грунтаваліся-б на ўзаемным давер'і і здаровым супрацоўніцтве, поўнасцю адпавядае інтарэсам і настроям народаў абодвух краін і, бясспрэчна, будзе садзейнічаць умацаванню міру і бяспекі не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце.

Вось чаму беларускі народ з усёй энергіяй падтрымлівае палітыку ўрада Совецкага Саюза, накіраваную на нармалізацыю адносін з Заходняй Германіяй, на ўрэгуляванне германскай праблемы на мірнай дэмакратычнай аснове.

Сучасны этап у развіцці міжнародных адносін з'яўляецца асабліва важным і адказным. У наш час з асаблівай сілай праяўляецца пастрымнае імкненне народаў да міру. Мы, як прадстаўнікі сваіх народаў у ААН, павінны прыслухоўвацца да голасу простых людзей, якія выступаюць у абарону міру, калі мы хочам апраўдаць іх давер'е. У барацьбе за мір мы павінны поўнасцю выкарыстаць уручаны нам па Статуту ААН адзіна прыгодны для гэтай высокай мэты сродак — сродак мірных цярплівых перагавораў. Мы ўжо маем многа прыкладаў, якія сведчаць аб тым, што шляхам перагавораў, пры ўзаемным жаданні ісці насустрач адзін другому, можна дабіцца вырашэння самых складаных міжнародных праблем. Так, калі з боку зацікаўленых

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы